УДК 61:615.1(043.2)
ББК 5:52.82
ISBN 978-985-21-0251-3


***Строк А. В.***

**ПАЛЯВЫЯ ТРАВЫ Ў НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЕ**

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Носік А. А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Народная медыцына ўзнікла ў глыбокай старажытнасці. З развіццём земляробства веды чалавека пра раслінны свет пашыраліся. Так, алей, выціснуты з семя лёну і канапель, служыў слабільным сродкам, а распаранае льняное семя – сродкам для прыпарак. Здаўна ад цынгі ўжывалі ў ежу цыбулю, часнок і хрэн, ад малакроўя – моркву і грэцкую кашу.

Сельскагаспадарчыя палі бачацца перш за ўсё як плошчы, засеяныя бульбай, жытам ці іншай культурнай раслінай, якая корміць чалавека або з'яўляецца лекавай сыравінай (напрыклад, кукуруза валодае жаўцягонным і мачагонным дзеяннем, кампрэсы з лёну здольныя лячыць лішаі і экзэмы, сланечнікавы алей выкарыстоўваецца для паніжэння халестэрыну ў крыві).

А вось васілёк, рамонак, хвошч і іншыя палявыя кветкі чалавек часта прымае за пустазелле і вядзе барацьбу з імі, каб атрымаць добры ўраджай збажыны ці караняплодаў. Але гэтыя "шкодныя" зёлкі таксама маюць лекавыя ўласцівасці і могуць выкарыстоўвацца ў народнай медыцыне. Нашы продкі мелі пэўныя веды пра кожную расліну і ўжывалі іх для лячэння розных захворванняў. На жаль, сёння грамадства не надта спяшаецца выкарыстоўваць правераныя стагоддзямі веды.

Абраная тэма з'яўляецца цікавай і актуальнай, таму даследаванне ставіць за мэту даведацца, якія палявыя травы могуць прымяняцца ў народнай медыцыне і з якімі мэтамі.

Для гэтага неабходна высветліць, якія палявыя травы, распаўсюджаныя на тэрыторыі Беларусі, маюць лячэбныя ўласцівасці і могуць выкарыстоўвацца для паляпшэння здароўя чалавека; прадэманстраваць, як нашы продкі выкарыстоўвалі падручныя зёлкі, каб пазбавіцца ад розных захворванняў; паказаць эфектыўнасць выкарыстання лекавых траў у народнай медыцыне. Белыя гронкі крываўніка, валошкі, рамонкі, смолкі, святаяннік – букет, у якім кожная кветка з'яўляецца карыснай раслінай, таму што здольна мацаваць здароўе людзей. Дык чаму ж не знайсці прымяненне гэтым зёлкам у народнай медыцыне, як рабілі гэта нашы продкі ў даўнія часы?

Репозиторий БГМУ